**УДК 94(476.5-21)+378.6.(476)(091)**

# ПОЛАЦКАЯ ЕЗУІЦКАЯ АКАДЭМІЯ: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ГАСПАДАРЧЫЯ АСПЕКТЫ СТВАРЭННЯ, ДЗЕЙНАСЦІ, СКАСАВАННЯ

***А.У. Ерашэвіч***
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле на аснове апублікаваных і архіўных крыніц, звестак навукова-даследчай літаратуры разгледжаны арганізацыйна-фінансавыя і матэрыяльна-гаспадарчыя аспекты стварэння, дзейнасці, скасавання Полацкай езуіцкай акадэміі – першай вышэйшай навучальнай установы на тэрыторыі сучаснай Беларусі часоў імператарскай Расіі ў 1812–1820 гг. Увага надаецца крыніцам і відам фінансавання цэнтра вышэйшай адукацыі ў Полацку з статусам універсітэта. Зроблены ўдакладненні і дапаўненні адносна фінансавага забеспячэння дзейнасці наступніка езуіцкай акадэміі – Полацкага вышэйшага піярскага вучылішча.*

***Ключавыя словы:*** *езуіты; Полацк; акадэмія; вышэйшая навучальная ўстанова; фінансаванне; рэсурсы*.

З канца XIX ст. да нашых дзён аб умовах стварэння, асноўных напрамках дзейнасці, абставінах ліквідацыі Полацкай езуіцкай акадэміі выйшла з друку шэраг навуковых даследаванняў польскіх, беларускіх, расійскіх і іншых гісторыкаў, якія вылучаюцца розніцай меркаванняў і ацэнак адносна месца і ролі гэтай вышэйшай навучальнай установы ў сістэме развіцця адукацыйна-выхаваўчай справы, навуковых ведаў, культуры на тэрыторыі Усходняй Беларусі ў 1812–1820 гг. Тэма прадстаўлена літаратурай рознай навуковай вартасці: як першымі агульнымі гістарычнымі аглядамі Ю.М. Гіжыцкага (выступаў пад псеўданімам Валыняк) [40], А.П. Сапунова [24], Л. Яноўскага [28], С. Заленскага [48], навукова-папулярнымі нарысамі [32, с. 121–125 і інш.], даведачнымі артыкуламі [35 і інш.], так і спецыяльнымі працамі, прысвечанымі передумовам стварэння езуіцкага цэнтра вышэйшай адукацыі ў Полацку [10; 11], даследаванню асноўных аспектаў педагагічнай дзейнасці ў Полацкай езуіцкай акадэміі [39, s. 57–142], высвятленню стану некаторых яе складовых частак, акадэміцкіх структур [31; 37], у тым ліку і друкаванню на польскай мове на працягу 1818 і 2 месяцаў 1820 г. першага на тэрыторыі Беларусі акадэмічнага літаратурна-навуковага часопіса «Miesięcznik Połocki» («Месенчнік Полацкі») [2; 8; 29; 30; 45]. Ролю Полацкай езуіцкай акадэміі ў кантэксце арганізацыі езуітамі адукацыі і асветы на тэрыторыі Усходняй Беларусі часоў расійскага панавання раскрыла ў сваёй манаграфіі Т.Б. Блінова [5, с. 148–181], у сувязі з фарміраваннем навучальных устаноў рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. закранала Р.У. Зянюк [9, с. 113–131]. У якасці асяродка польскай культуры, спецыфічнай мадэлі рэалізацыі польскай культурнай праграмы на былых усходніх граніцах Рэчы Паспалітай функцыянаванне навукова-асветных структур акадэміі езуітаў у Полацку (бібліятэкі, друкарні, тэатра, музея, мастацкай галерэі і інш.), на аснове выкарыстання значных дакументальных матэрыялаў, выяўленых у архівах, бібліятэках і музеях Рыма, Варшавы, Кракава, Вільні, Санкт–Пецярбурга, Мінска, Полацка і апрацаваных аўтарам, плённа вывучала польская даследчыца І. Кадульска [41–44 і інш.]. Лёсам Полацкай езуіцкай акадэміі цікавіўся полацкі гісторык В. Шайкоў – аўтар шэрагу змястоўных артыкулаў па праблеме [33; 34] і іншыя даследчыкі, матэрыялы даследаванняў якіх размешчаны для прагляду ў электроннай форме ў рэсурсах аддаленага доступу [27; 36 і інш.].

У цэлым, у навуковай літаратуры асноўная ўвага надавалася высвятленню арганізацыйнай структуры, асабовага складу кіраўніцва, напрамках адукацыйнай дзейнасці, выяўленню характару навучання і яго забеспячэння неабходнымі дапаможнымі навукова-адукацыйнымі структурамі (бібліятэка, музей і інш.), абсталяваннем і дыдактычнымі сродкамі навучання. Так, у выдадзенай у апошнія часы кніге (як лічыць аўтар, першым комплексным ? у беларускай гістарыяграфіі даследаванні, падрыхтаваным на аснове малавядомых французскіх і польскіх ? выданняў, архіўных матэрыялаў?, сведчанняў сучаснікаў ?) прыведзены звесткі і адзначаны гістарачныя передумовы стварэння Полацкай езуіцкай акадэміі і яе папярэднікаў (калегіі і навіцыяту), раскрыты асаблівасці ўнутранага ўладкавання езуіцкага цэнтра вышэйшай адукацыі праз вызначэнне структуры адміністрацыйных і вучэбных падраздзяленняў, бібліятэкі. Значнае месца ў кніге адводзіцца вызначэнню парадку навучання шляхам дэталізацыі асабовага складу выкладчыкаў, пералічэння вучэбных дысцыплін, выкладання правілаў вучобы і надання вучоных ступеняў, паказу ўмоў для забеспячэння быту выхаванцаў і настаўнікаў, распаўсюджаных нораваў у іх асяроддзі, высвятленню ўкладу выпускнікоў у развіццё культуры розных краін [6]. Тым не менш, на наш погляд, некаторыя моманты гісторыі Полацкай езуіцкай акадэміі, у тым ліку звязаныя з высвятленнем арганізацыйна-фінансавых і матэрыяльна-гаспадарчых аспектаў яе стварэння, дзейнасці і скасавання, патрабуюць больш глыбокага, з апорай на архіўныя першакрыніцы, даследавання.

Згодна з імянным указам ад 13.01.1774 г. езуітам дазвалялася выкладанне ў навучальных установах арганізаваных імі калегіумах, а езуіцкія манастырскія сяляне вызваляліся ад пагалоўнага і віннага падаткаў [22].

Полацк з’яўляўся буйным адукацыйным асяродкам у Віцебскай губерні. Да адкрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі, у мясцовым калегіуме ў 1802–1811 гг. атрымлівалі веды ад 317 да 441 навучэнцаў. У прыватнасці, у Полацкай езуіцкай школе ў 1802 г. праходзілі навучанне 372 вучня, у 1803 г. – таксама 372, у 1805 г. – 441, у 1806 г. – 411, у 1807 г. – 317, у 1808 г. – 318, у 1809 – 326, у 1811 г. – 345 [5, с. 147].

Пры Полацкай езуіцкай калегіі працавала музыкальная бурса (капэла). У 1802 г. у ёй рыхтавалі 10 музыкантаў, у 1807 г. – 16, у 1817 г. – 22, у 1818 г. – 25. Іх навучалі 7 настаўнікаў-музыкаў, якія атрымоўвалі за гэты занятак і ігру на аргане ў мясцовым касцёле ад 40 да 100 руб. штогод [20, арк. 42].

Сродкам павелічэння колькасці іншагародніх вучняў выступалі платныя канвікты (пансіёны) пры езуіцкіх манастырах ці інтэрнаты для шляхецкіх дзяцей ад 7 ад 14 год. Штогодны кошт ўтрымання ў іх вызначаўся сумай у 100 руб. серабром. Частка бедных вучняў пражывала бясплатна. Таксама быў развіты інстытут дырэктараў (наглядчыкаў), калі настаўнікі ці вучні старшых класаў за пэўную плату бралі на сябе абавязак нагляду, па дамове з бацькамі ці сваякамі, за вучнямі малодшых класаў. У 1774 г. у агульных школах Полацкай езуіцкай калегіі было 7 трымальнікаў канвіктаў, якія працавалі за пэўную плату і 12 семінарыстаў з беднай шляхты, за якімі наглядаў свецкі выхавальнік-шляхціц з выдачай яму каля 50 руб. [5, с. 124]. Калі верыць даным 1803 г. з рэвізіі навучальных устаноў Віцебскай і Магілёўскай губерняў

В.М. Севергіна, пансіён пры Полацкім езуіцкім вучылішчы быў разлічаны на 24 шляхецкіх бедных дзяцей, а канвікт Шадурскага на 43 вучняў, на 33 з якіх выдавалася па 70 руб., на 10 – па 65 руб., разам на ўсіх 2960 руб., а 12 вучням давалі па 50 руб. міластыні [3, с. 98–99]. Візітатар навучальных устаноў Л. Плятэр адзначыў, што ў 1807 г. у Полацкім езуіцкім калегіуме было 327 вучняў. З гэтай колькасці 61 чал. з бедных шляхецкіх дзяцей і 4 дамашнія наглядчыкі (дазорцы) ўтрымліваліся за кошт фундуша Гільзена-Шадурскіх, 24 вучня і 2 наглядчыкі жылі за кошт калегіума разам з 16 шляхцiцамі пры касцёльнай музыкальнай бурсе. Усяго на розных фундушах было 172 вучняў з наглядчыкамі, у канвікце – 41 навучэнец [48, s. 316–317]. У 1808 г. з 318 вучняў у канвікце лічылася 48, за кошт фундуша Гільзена-Шадурскіх утрымлівалася 62, а 41 жылі за ўласны кошт [48, s. 318]. Полацкі канвікт для шляхецкіх дзяцей быў адкрыты па дагавору з езуіцкімі манахамі і ўжо працаваў у 1801 г. У 1807 г. у ім было 41 выхаванцаў, у 1808 г. – 48, у 1817 г. – 62 [20, арк. 36 адв.; 39, s. 22–23, 27–29; 47]. У Полацкім шляхецкім інтэрнаце за ўтрыманне трэба было заплаціць з 1803 да 1816 гг. па 100 руб. серабром штогод з выхаванца [39, s. 22]. У Полацкім езуіцкім канвікце быў рэгенс і 5 настаўнікаў. Навучанне і нагляд за хлопчыкамі ад 8 да 14 год прадугледжваліся на бясплатных умовах, але за ўтрыманне выхаванцаў трэба было плаціць штогод 150 руб., а за пакаёўца асобна 20 руб. [40, s. 13, 14]. Аплата праводзілася ў два тэрміны: у пачатку навучальнага года і ў першыя дні сакавіка, альбо 15.09. і 15.03. [47]. Грошы прызначаліся для ўтрымання канвінктнага будынка, яго ацяпленне і асвятленне, на рамот печаў, акон, сталоў, крэслаў, дахаў, для набыцця кухоннага абсталявання і сталовага посуду, на выдачу жалавання выхавальнікам, урачу, вартавому, на харчаванне выхавальнікаў [5, с. 212]. Навучанне танцам, музыке, маляванню і інш. забяспечвалася шляхам выдачы асобнай выплаты настаўнікам гэтых прадметаў. Асобна трэба было плаціць за лекі, адзенне, паслугі прачкі. На набыццё абутку і школьных прыналежнасцей (кніг, паперы, чарніл і г.д.) дадаткова адлічалася некалькі дзесяткаў рублёў. Звычайна плацёж адбываўся адначасова з выплатай за ўтрыманне выхаванцаў у канвікце. Бацькі ці іх заступнікі былі абавязаны забяспечваць навучэнцаў адзеннем, іншымі прадметамі, неабходнымі ім у быце ( пасцеллю, бялізнай, «шлафрокам», некалькімі абрусамі, парасонкам, сталовымі прыналежнасцямі (прыборам), нажом, нажніцамі і інш.) [47; 5, с. 213] (падрабязней гл. [4]).

Для маламаёмных вучняў з дзяцей беднай шляхты арганізоўваліся семінарыі ці інстытуты з поўным утрыманнем навучэнцаў. У Полацкім шляхецкім інстытуце штогод у 1802–1818 гг. было ад 24 да 49 пансіянераў (у 1802 і 1803 гг. было па 24 вучняў, у 1805 г. – 49, у 1806 – 39, у 1807 г. – 24 ці 53, у 1808 г. – 41, у 1817 г. – 33, у 1818 г. – 27). Нагляд за вучнямі і дапамагу ім у вучобе, акрамя езуіта, аказвалі 2 дырэктары ці інспектары, якім выдаткоўвалася за працу 45 руб. штогод [5, с. 202–203]. У вялікім доме каля Полацкага езуіцкага калегіума былі арганізаваны прыватныя ўрокі з поўным утрыманнем вучняў і выплатай за кожнага навучэнца 700 руб. асігнацыямі ці 200 руб. серабром [39, s. 125].

Ідэалагічная барацьба за сферы духоўнага ўплыву і за душы моладзі паміж Віленскім універсітэтам і езуітамі мела вынікам з’яўленне восенню 1811 г. праекта арганізацыі асобнай езуіцкай навучальнай акругі з падпарадкаваннем яе не Вільні, а непасрэдна Санкт-Пецярбургу. Знешне дэманструючы сваю лаяльнасць і прыхільнасць да імператарскай Расіі, езуіты як паслядоўнікі палітыкі прабабілізму (выкарыстанне магчымасцей часу і прасторы, удалае прыстасаванне да вярхоўнай улады, канфармізм; тэорыя прабабілізма для вытлумачэння кожнага ўчынка на карысць езуітаў без уліку агульнапрынятых норм маралі для дасягнення мэты любымі сродкамі была распрацавана езуітам Бузенбаўмам) дамагаліся стварэння асобнай, незалежнай ад Віленскага ўніверсітэта, вышэйшай навучальнай установы. Імкнучыся выйсці з-пад адміністрацыйнага кантролю «польскага» ўніверсітэта ў Вільне, яны даводзілі расійскім уладам, што гэтая свецкая ўстанова вышэйшай адукацыі марнавала казённыя сродкі і, хоць і давала спецыяльныя веды, але пладзіла разбэшчаных, амаральных студэнтаў. Выйсце з падобнага шляху бачылася не ў прытрымліванні выкладчыкаў і навучэнцаў ліберальным ідэям, а кансерватыўным прынцыпам на аснове традыцыяналізму, духоўна-маральнага абсалютызму, палітычнага эліцізму з абапорай на каштоўнасці і ідэалы манархічнай дзяржавы, царквы, сям’і, непарушнасці прыватнай уласнасці і сацыяльнай нярoўнасці ў працэсе эвалюцыйных змен у грамадстве.

Задума аб стварэнні вышэйшай езуіцкай навучальнай установы адносіцца да 1807 г. і была звязана з часам другога, пасля чэрвеня 1802 г., наведвання імператарам Аляксандрам I Полацку [33, с. 177]. З мэтай супрацьстаяння і паслаблення паланафільскіх уплываў Віленскага ўніверсітэта, праяўляючы імкненне да прымірэння з шляхецкай грамадскасцю і рымска-каталіцкай царквою напярэдадні вайны з Напалеонам, царскі ўрад дазволіў езуітам арганізаваць цэнтр вышэйшай адукацыі, у якім вучэбныя прадметы павінны былі выкладацца на рускай мове і па рускіх падручніках. Да таго ж, фінансаванне новага цэнтра вышэйшай адукацыі меркавалася не за кошт дзяржаўных сродкаў, а матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў самога езуіцкага ордэна.

12.01.1812 г. выйшла ўхваленая імператарам Аляксандрам I пастанова аб ператварэнні Полацкага калегіума ў акадэмію езуіцкага ордэна з правамі ўніверсітэта [23; 26, стб. 766–767; 39, s. 41–43]. Пісьмаводства езуіцкай акадэміі пазбаўлялася ад плацяжу пошлін і выкарыстання гербавай паперы. Студэнтам-выпускнікам надаваўся чын 14-га класа адпаведна чыноўніцкай табелі аб рангах [7, с. 210; 26, стб. 778–782]. У 1814 г. у Міністэрства народнай асветы быў накіраваны праект статута езуіцкай акадэміі разам з належачымі ёй інстытутамі, пансіёнамі, семінарыямі, бурсамі і іншымі навучальнымі ўстановамі, які вызначаў яе арганізацыйна-штатную структуру, рэгламентаваў правы і абавязкі выкладчыкаў і навучэнцаў, арганізацыю вучэбнага працэсу [33, с. 178]. Рэктар Р. Бржазоўскі прасіў зацвердзіць устаў, але яго разгляд ва ўрадавых колах быў прыпынены.

Арганізаваная на базе Полацкага езуіцкага калегіума акадэмія ні ў вучэбна-метадычных, ні ў адміністрацыйна-гаспадарчых адносінах не падпарадкоўвалася Віленскаму ўніверсітэту і змяншала сферу яго ўплыву ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. Па сутнасці стваралася асобная навучальная акруга, якой падпарадкоўваліся ўсе езуіцкія навучальныя ўстановы ў Расійскай імперыі, ці канцэнтравалася кіраўніцтва ўсімі езуіцкімі школамі ў межах Расійскай імперыі. У ведамстве Полацкай езуіцкай акадэміі знаходзіліся езуіцкія школы не толькі ў Віцебску, Магілёве, Оршы, Мсціслаўлі, Чачэрску, Дынабургу, Краславе, Ужвальдзе, але і Пецярбургу, Астрахані, Адэсе, Рыге, Раманаве на Валыні [39, s. 143–242] (у Расіі езуіцкія калегіумы былі заснаваны ў Санкт-Пецярбургу і ў Раманаве на Валыні, рэзідэнцыя ў Рыге, місіі ў Саратаве, Адэсе, Астрахані, Маздоку, Іркуцку і Томску). Утварыўся альтэрнатыўны і канкурэнтны Віленскаму ўніверсітэту цэнтр вышэйшай адукацыі на Усходзе Беларусі. Так, у 1818 г. у Віленскім універсітэце было 39 прафесараў, якія выкладалі для 500 студэнтаў, а ў Полацкай езуіцкай акадэміі – адпаведна 47 для 520 навучэнцаў.

Праўленне акадэміі езуітаў уключала рэктара, канцлера, 3 дэканаў, 4 кансультатараў, сакратара. У навучальнай установе былі створаны 3 факультэты: вольных мастацтваў (8 прафесараў), моўны (7 прафесараў), багаслоўскі (4 прафесары)

(у 1815 г. апошнія два былі аб’яднаныя ў філасофска-філалагічны). Пры езуіцкай акадэміі меўся 5-класны калегіум (статус гімназіі) з 14 выкладчыкамі, прыходскае вучылішча з асобным настаўнікам, шляхецкі пансіён з 5 выкладчыкамі (з выхаванца за ўтрыманне бралі па 600 руб.), семінарыя з 3 наглядчыкамі для 54 дзяцей беднай шляхты і бурса для бедных дзяцей з падатковых саслоўяў [23]. У Полацкай езуіцкай акадэміі былі бібліятэка, у якой налічвалася каля 40 тыс. тамоў, архіў, значныя навуковыя і вучэбныя калекцыі прадметаў і абсталявання, архітэктурныя мадэлі, прыродазнаўчы музей, фізічны, механічны, нумізматычны кабінеты, хімічная лабараторыя, друкарня, аптэка, карцінная галерэя.

Полацкая езуіцкая акадэмія – першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі часоў імператарскай Расіі – была ўрачыста адкрыта 10(22).06.1812 г. З прычыны вайны з Напалеонам вучэбныя заняткі ў ёй намінальна пачаліся з 8.01.1813 г. [24, с. 13–15]. З прычыны спусташэнняў мінулай вайны пачатак навучальнага працэсу ў 1813 г. планаваўся з сакавіка, але па сутнасці вучэбны год распачаўся 3.11.1813 г. У езуіцкую акадэмію з 4-гадавым тэрмінам навучання прымалі дзяцей усіх свабодных саслоўяў і веравызнанняў. У Полацкай езуіцкай акадэміі з 15.09.1814 па 15.09.1815 гг. вучылася 136 чал., у тым ліку 50 езуітаў, 11 базыяльн, 10 прадстаўнікоў белага духавенства, 65 свецкіх асоб (47,8 %) [25, с. 151]. Такім чынам, у езуіцкай акадэміі ў Полацку спачатку дэклараваўся і забяспечваўся дэмакратычны склад навучэнцаў: у ёй маглі вучыцца падлеткі незалежна ад этнічнага паходжання, канфесійнай і саслоўнай прыналежнасці. Згодна з палажэннем Камітэта міністраў ад 27.06.1817 г. у Полацкай езуіцкай акадэміі маглі навучацца толькі юнакі рымска-каталіцкага веравызнання [26, стб. 1052]. У езуіцкай акадэміі 39 выкладчыкаў навучалі да 600 студэнтаў. Навучанне студэнта каштавала 600 руб. штогод [1, с. 170].

Статус вышэйшай навучальнай установы ўніверсітэцкага тыпу забяспечыў за Полацкай езуіцкай акадэміяй права надання вучоных ступеняў. З 11.08.1814 г. духоўныя асобы маглі атрымліваць ступені магістраў свабодных мастацтваў і багаслоўя, дактароў філасофіі, багаслоўя, грамадзянскага і кананічнага права [26, стб. 830–832]. З яе сцен з 15.09.1814 да 15.09.1819 гг. выйшлі 123 выпускнікі, у тым ліку 60 чал. атрымалі званне дактароў (17 тэалогіі і кананічнага права, 43 – грамадзянскага права), 36 кандыдатаў (5 багаслоўя, 27 – філасофіі, 1 – свабодных навук, 3 – юрыспрудэнцыі), 25 чал. магістраў (13 багаслоўя, 10 – філасофіі, 2 – свабодных навук). [5, с. 179; 34, с. 80–81].

Калі навучальны працэс у Полацкай езуіцкай акадэміі кантраляваўся з боку Міністэрства народнай асветы, то гаспадарча-фінансавыя пытанні вырашаў генерал ордэна. Езуіцкая акадэмія забяспечвалася не за кошт урадавых асігнаванняў, а за кошт крыніц даходаў з паезуіцкіх маёнткаў езуіцкага ордэна, якія давалі штогод да 174418 руб. [28, с. 598].

Рымска-каталіцкія царкоўныя ўстановы атрымлівалі прыбыткі з розных крыніц. У структуру і склад найбольш значных даходаў уваходзілі паступленні за кошт фальваркава-паншчыннай гаспадаркі і эксплуатацыі сялян, ад прадпрымальніцкіх відаў дзейнасці (арэнда розных аб’ектаў, вінакурства, трыманне корчмаў і інш.), ліхвярскіх аперацый, выплат за розныя рэлігійныя паслугі.

Езуіцкі ордэн выступаў буйным зямельным уласнікам. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Полацкі езуіцкі кляштар меў 129 вёсак з 4791 чал. падуладнага яму насельніцтва. Сярод населеных пунктаў вылучаліся вёскі Парэчча (112), Булаўкі (104), Сяляўшчына (90), Слабада (75), Кушлікі (66), Мацейкава (60), Гарбузоўка (34), Сіротава (23), Капавішча (18) [33, с. 175].

Падрабязна стан забеспячэння рознымі відамі матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў зафіксаваны ў матэрыялах акту візіту ўстаноў Полацкай акадэміцкай калегіі з 11.01. да 5.02.1818 г. У наступным 1819 г. Полацкая акадэміцкая калегія налічвала 120 сябраў (33,6 %) з 357 у Расіі, у тым ліку 63 капланаў, 28 клерыкаў, 29 братоў і была найбольшай па колькасці членаў і матэрыяльнаму дастатку [38, s. 165–166].

Усяго ў Полацкім калегіуме пад час візітацыі лічылася 166 чал. У Полацкай акадэміцкай калегіі было 42 ксяндзоў, 22 клерыкаў (4 з іх былі настаўнікі пачатковых школ), 29 братоў, 18 капланаў, разам 111 езуітаў [17, арк. 16–17], з дадаткам слуг [17, арк. 17 адв.–18 адв.]. У Полацку меўся публічны канвікт і інстытут для дзяцей беднай шляхты ў складзе 27 асоб [17, арк. 11 адв., 12]. Каплан Полацкага парафіяльнага касцёла Ян Шанлевіч атрымліваў 185 руб. пенсіі, бясплатна карыстаўся сталом і памяшканнем [17, арк. 8]. Шляхецкія слугі ў Полацкім калегіуме атрымлівалі «juirgielt» (утрыманне, гадавую плату, штогоднае жалаванне наймітам – А.Е.). У прыватнасці вядома, што музыкі-настаўнікі валодалі зарплатай ад 25 да 100 руб. (Тамаш Дабушынскі набываў 100 руб., Адам Навіцкі таксама 100 руб., Гіпаліт 80 руб., Станіслаў Навіцкі 70 руб., Тамаш Пагоскі 60 руб., Ян Кошко 40 руб., Ян Маркевіч зноў жа 40 руб., Казімір Ласкі 30 руб., Якуб Жыркевіч 25 руб., Павел Драздовіч 20 руб.). Канцылярысты Шыман Шыманскі і Ян Сыціанка атрымлівалі па 30 руб., дазорцы (наглядчыкі) семінарыі Вінцэнт Ліпскі і Базылі Рокланскі – па 45 руб., правізар аптэкі Ян Віллых – 1200 руб., памочнік аптэкара Людвік Массыні – 120 руб., настаўнік элементарнай школы Ян Пяхоўскі – 100 руб., слуга Ежы Гойжэўскі – 20 руб., астатнія – у асноўным невялікае ўтрыманне да 10 руб. у год [17, арк. 17 адв.]. За слуг Полацкага калегіума гэтая ўстанова выплачвала скарбовыя падаткі ў памеры 660 руб. асігнацыямі [17, арк. 18 адв.].

Зямельны фундуш Полацкай акадэміцкай калегіі складаўся з 2402 валок зямлі і 2550 валок лесу, у якіх было ўлічана сялян 6079 мужчын і 5577 жанчын. Фундушавых, легацыйных (з запісаных уладальнікам на іншую асобу валодання сваёй часткі ці цалкам маёмасці), даробковых (маёмасных) сум не было адзначана. Маглі паступаць пры590 прырослыя працэнты падараваных (даравізнаў) капіталаў свецкіх асоб і эск-езуітаў: за кошт грашовых унёскаў прынятых у езуіцкі ордэн прэлатаў, канонікаў, ад дэпазітаў свецкіх прыватных асоб як яшчэ жывучых, так і ўжо памерлых [17, арк. 19].

У структуры даходаў Полацкай акадэміцкай калегіі, вызначаных у памеры 127728 руб. асігнацыямі (27936 руб. наяўнымі грашыма (21,9 %) і 99792 руб. ацэненых фальваркавых прадуктаў (78,1 %), з фальваркаў паступала 12,5 % наяўнымі грашыма, 3,5 % сумы прыпадала на розныя выпадковыя, нясталыя даходы, 2,9 % – на даход ад млынаў, 1,8 % – ад аптэкі, 1,1 % – ад гамерні (кузні) і толькі 0,04 % ад юрыздык. Іншымі словамі, асноўныя прыбыткі Полацкая акадэміцкая калегія мела за кошт выкарыстання зямельных рэсурсаў і працы падуладных сялян.

Выдаткі Полацкай акадэміцкай калегіі вызначаліся сумай у 27396,35 руб. асігнацыямі і размяркоўваліся наступным чынам: 6583 руб. (24,2 %) выдаткоўвалася на хмель, мёд, віно, ром, 5900,3 руб. (21,6 %) складалі так званыя кансумпцыйныя прадметы (спажывецкія тавары) – соль, кава, цукар, вострыя прыправы, тытунь, рыба, дзічына, 3009 руб. (11 %) адлічаліся на семінарыю, бурсу, паўпераў (жабракоў) і розныя міласціны (jałmużny), 2883 руб. (10,6 %) – на аплату службовых асоб пры касцёле, кляштары, аптэкі, семінарыі, дамовай чэлядзі, 2500 руб. (9,2 %) – на прадметы дамашняга ўжытку (хатнія рэчы) і гаспадарчыя запасы, 2274 руб. (8,3 %) – на мыццё бялізны, 2150 руб. (7,9 %) – на пошту, дарогі, валокі, 1000,05 руб. (3,7 %) – на ўтрыманне аптэкі, 960 руб. (3,5 %) – на бібліятэку, школу, музей [17, арк. 19–19 адв.].

Чысты прыбытак у памеры больш 100 тыс. руб. асігнацыямі (78,3 % валавых даходаў) быў дастатковы для ўтрымання школ, Полацкай акадэміі, ордэнскіх службовых асоб, касцёльных і кляштарных слуг. Штогодны ж абарот полацкіх езуітаў дасягаў сумы ў 200 тыс. руб. [14, арк. 172 адв.]. І гэта пасля значных страт, якія пацярпеў Полацкі калегіум у выніку спусташэнняў 1812 г. Пасля вайны з Напалеонам паводле люстрацыі маёмасці Полацкі калегіум страціў 132 хаты і 1395 душ, рэчаў на суму ў 202100 руб. Страты фальваркаў ацэньваліся ў значную суму ў 1191836 руб. [17, арк. 19 адв.], альбо ў памеры больш 9 гадавых прыбыткаў.

Па нашых падліках згодна з актам візітацыі, для грашовага ўтрымання служачых у складзе 191 асобы адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу ў фальварках Полацкай езуіцкай акадэміі адлічалі 5094 руб. Даход з 50 корчмаў вылічаўся ў 10500,69 руб. асігнацыямі [17, арк. 21 адв., 22, 23, 24, 25, 26 адв., 29 адв., 31 адв., 32 адв., 33, 33 адв., 34, 34 авд.–35, 35–35 адв., 36 адв., 36 а., 36 а адв.].

Полацкую езуіцкую акадэмію абслугоўвалі не менш 21 фальваркаў з улікам і іх частак: Альбрэхтоў (Альбрэхтава), Непадовічы, Крашуты, Спас, Юрэвічы, Аболь (Обаль), Сосніца, Струнь з часткай Вехачэнь, Станіславаў (Станіславаў) з часткай Мосарж, Улазовічы ў Полацкім павеце, а таксама Мошнікі, Забаровак (Забароўкі) у Гарадоцкім павеце, Ползіна і Кушлікі ў Дрысенскім павеце, Стайкі ў Невельскім павеце, Утужыца (Устужыцы) і Жанвіль у Себежскім павеце, Учановічы з часткай Задарожэ ў Сеннескім павеце. Згодна з выпіскай аб павіннасцях сялян другіх паезуіцкіх маёнткаў пры ранейшых езуітах, паказаных пры здачы маёнткаў у арэнду, у фальварках Полацкай акадэміцкай калегіі адпрацовачныя павіннасці заключаліся ў апрацоўке моргу зямлі з уладальніцкай чвэрці ці паловы валокі, у 2 днях прыгону (з чвэрці ці 1/8 часткі валокі) ці 3-4 дні (з паловы валокі) ў тыдзень з рабочай душы мужчынскага і жаночага полу, у малацьбе, у згонах для вывазу ўгнаення на палі і ўраблення сенажацей. Даніна збіралася з цяглай зямлі (1/2, 1/4, 1/8 часткі валокі) у памеры 2-3 курыц, 20-30 яек, часам 2 фунтаў мёду, 4 фунтаў хмелю (фальваркі Спас, Юрэвічы, Забаровак) [15, арк. 80–86 адв., 87 адв., 91 адв.–94].

Пасля выдалення езуітаў у 1820 г. з Расійскай імперыі іх маёнткі паступілі ў казённае ведамства. У фальварках полацкіх езуітаў было зарэгістравана 6296 рэвізскіх душ мужчын, у тым ліку ў Полацкім павеце 4377 (па іншым даным 4354). Прыкладны даход з фальваркаў па звестках асоб, якія прымалі маёнткі, быў вызначаны ў 66018,46 руб., але новыя адміністратары-памешчыкі паказалі валавы даход з сакавіка 1820 па 23.04.1821 г. у памеры 44253,86 руб. (у 1,5 разы менш), а чысты прыбытак ацанілі толькі ў 19678,28 руб. (44,5 % ад сумы прыходу) (гл. табл. 1).

Табліца 1. – Прыблізны даход з фальваркаў полацкіх езуітаў па паказаннях адміністратараў-памешчыкаў з сакавіка 1820 па 23.04.1821 г. [19, арк. 9–10, 115–115 адв.]

| Фальваркі | Рэвізскіх душ мужчын | Прыкладны даход па звестках асоб, якія прымалі маёнткі | Паказана адміністратарамі з сакавіка 1820 па 23.04.1821 г. | | | Адміністратары-памешчыкі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Прыход | Расход | Рэштак | |
| Спас | 630 | 6373,1 | 6120,53 | 5451,53 | 669 | Пядзевіч |
| Юрэвічы | 129 | 200,9 | | | | |
| Улазовічы | 296 | 2504,8 | 2090,47 | 1857,97 | 232,5 | Васілеўскі |
| Станіслававa | 512 (510) | 3737,6 | 2390 | 1263 | 1127 | Будзько |
| Обаль | 557 | 5332,5 | 2495,5 | 547 | 1948,5 | Грабніцкі |
| Сосніца | 316 | 4698 | 8142,76 | 3515 | 4627,76 | Маёр Макавецкі |
| Струнь | 395 (374) | 3466,9 | | | | |
| Крашуты | 557 | 6597,8 | 1447,05 | 1447,05 | | Рэўт |
| Альбрэхтава | 714 | 4788 | 10388 | 5424,75 | 4963,25 | Падпалкоўнік Гласко |
| Непадовічы | 271 | 2868 | | | | |
| Мошнікі | 344 (343) | 3543,3 | 2520,25 | 544,45 | 1975,8 | Жаба |
| Забароўкі | 161 | 4083,1 | 2249,75 | 620,95 | 1628,8 | Бессарабскі |
| Ползіна | 232 | 1545 | 862,5 | 850 | 12,5 | Скорень |
| Кушлікі | | 960 | 610 | 610 | | Корсак |
| Стайкі | 477 | 4521,91 | 1135,65 | 1077,55 | 58,1 | Паручнік Ласоўскі |
| Утужыца | 379 (383) | 4971,9 | 3801,4 | 1366,33 | 2435,06 | Бедрыцкі |
| Жанвіль | 326 (310) | 5825,65 | | | | |
| Разам | 6296 | 66018,46 | 44253,86 | 24575,58 | 19678,28 | |

Пераемнікамі Полацкай езуіцкай акадэміі сталі манахі-піяры. З-за недахопу фінансавых сродкаў і настаўнікаў у жніўні 1822 г. піяры закрылі гімназіяльнае вучылішча ў Віцебску і перавялі усіх манахаў у Полацк. Здача Полацкага паезуіцкага манастыра піярам была скончана да 1.08.1822 г. [16, арк. 97].

На базе пераведзенага ў Полацк Віцебскага піярскага гімназічнага вучылішча 10.03.1822 г. было прынята рашэнне аб арганізацыі Полацкага піярскага вышэйшага вучылішча [25, с. CVII], якое размясцілася 16(28).08.1822 г. у будынках былой Полацкай езуіцкай акадэміі і пачало працу 1.09.1822 г. Яно ўключала прыходскае (падрыхтоўчы клас) і 4-класнае павятовае вучылішчы з гімназічным курсам. У 2 аддзяленні вышэйшага піярскага вучылішча з 15.09.1822 г. былі 3-гадавыя «курсы вышэйшых навук» (літаратурны і матэматычны аддзелы) па праграмах расійскіх ліцэяў [39, s. 134; 21, с. 74]. Для ўтрымання гэтай вышэйшай навучальнай установы піяры атрымлівалі штогод па 28 тыс. руб. асігнацыямі з дзяржаўнага казначэйства на кошт другіх паезуіцкіх маёнткаў [26, стб. 1650]. Вядома, што ўказам ад 10.03.1822 г. за студзеньскую трэць 1822 г. была асігнавана да выдачы сума ў 9333 руб. 33 1/3 кап. для патрэб Полацкага паезуіцкага кляштара, даручанага заступаючаму месца рэктара піярскага ордэна ксяндзу, іераманаху Даменіку Серафіновічу. Ён жа ўзначаліў Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча [16, арк. 1, 12]. Кожны навучэнец павінен быў здаваць па 5 руб. на ўтрыманне вучылішнага дома [1, с. 130]. Пры вышэйшым піярскім вучылішчы быў адкрыты шляхецкі канвінкт на 40 чал. Утрыманне кожнага пансіянера каштавала 500–600 руб. асігнацыямі штогод [21, с. 75]. Звычайна за размяшчэнне вучняў плацілі штогод 600 руб., апроч пакаёвага. Абедзенны стол навучэнца складаўся з 5 страў, вячэрні – з 4, апроч сняданку і падвячорку. Вучні карысталіся пакоем з ацяпленнем і асвятленнем і інш. Бацькі ці апекуны набывалі за свой кошт для выхаванцаў адзенне, абутак, плацілі грошы доктару ці рэгенту ў выпадку хваробы. Яны асобна дамаўляліся з мэтрамі аб умовах аплаты іх працы за навучанне

падапечных асновам англійскай і італьянскай моў, музыкі, танцаў, фехтавання, заключалі дамову з прачкай аб абслугоўванні юнакоў [46, s. 93, 94. 95]. Не ўсе належныя сумы за інтэрнат выплачваліся ў належны тэрмін і ў поўным аб'ёме. Згодна з прашэннем рэктара Барташэвіча аб прымушэнні некаторых землеўладальнікаў унесці плату за навучанне іх дзяцей пасля закрыцця Полацкага вышэйшага піярскага вучылішча, доўг 9 памешчыкаў за навучанне дзяцей і наём для ніх кватэраў у пансіёне складаў 1401,72 руб. [12, арк. 1–2 адв., 7].

Штат Полацкага піярскага вучылішча і паезуіцкай царквы сведчыць, што з 8760 руб. серабром на ўтрыманне 14 піяраў, манастыра з вучылішным домам, царкоўных і манастырскіх служыцелей адпускалася 5850 руб. (66,8 %), на жалаванне 6 настаўнікам – 1560 руб. (17,8 %), на падтрымку дапаможных адукацыйных структур (фізічнага кабінета, хімічнай лабараторыі, батанічнага сада з садоўнікам, бібліятэкі з выпіскай перыядычных твораў) – 750 руб. (8,6 %), на доктара, аптэку і цырульніка – 600 руб. (6,8 %) (гл. табл. 2).

Табліца 2. – Штат Полацкага піярскага вучылішча і паезуіцкай царквы [18, арк. 31]

| Артыкулы ўтрымання | Руб. сер. |
|---|---|
| На 14 піяраў | 4200 |
| На манастыр і вучылішны дом | 1000 |
| На царкоўных і манастырскіх служыцеляў | 650 |
| На настаўніка расійскай славеснасці і гісторыі | 400 |
| На 4 настаўнікаў моў (рускай, грэчаскай, французскай, нямецкай) | 960 |
| На настаўніка сітуацыйных чарцяжоў | 200 |
| На фізічны кабінет | 100 |
| На хімічную лабараторыю | 150 |
| На батанічны сад з садоўнікам | 300 |
| На бібліятэку з выпіскай перыядычных твораў | 200 |
| На доктара, аптэку і цырульніка | 600 |
| Разам | 8760 |

Згодна з сакрэтным рапартам полацкага паліцмайстра палкоўніка Гінглінга віцебскаму грамадзянскаму губертнатару А.І. Саракунскаму ад 26.02.1824 г. у Полацкім піярскім вучылішчы вучылася 196 каталіцкіх, 8 праваслаўных і 3 лютэранскіх навучэнцаў [13, арк. 3].

Паводле ўказа ад 21.02.1830 г. манахі-піяры былі прызнаны «чужымі» для дзяржаўнай карысці, і Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча было закрыта. У красавіку 1830 г. піяры пераехалі ў Вільню. На месцы былога вышэйшага піярскага вучылішча быў створаны кадэцкі корпус «для проведения в Западном крае идеи русского просвещения, русского патриотизма и русского дела».

Такім чынам, Полацкая езуіцкая акадэмія, у адрозненне ад Віленскага ўніверсітэта, які забяспечваўся за кошт мэтавых паезуіцкіх даходаў з нерухомых маёнткаў і капіталаў у памеры да 300 тыс. руб., а таксама бенефіцыяльных збораў, існавала за кошт розных форм і відаў прыбыткаў езуіцкага ордэна. У структуры валавых даходаў Полацкай акадэміцкай калегіі прыкладна 22 % збораў паступала наяўнымі грашыма, а асноўная частка (78 %) прыходзілася на ацэненыя фальваркавыя прадукты за кошт выкарыстання зямельных рэсурсаў і працы падуладных сялян. Чысты прыбытак у памеры больш 100 тыс. руб. асігнацыямі (больш 78 % валавых даходаў) рабіў магчымым утрыманне адукацыйных і рэлігійна-выхаваўчых езуіцкіх цэнтраў, у тым ліку і Полацкай езуіцкай акадэміі, якая за непрацяглы 8-гадавы тэрмін дзейнасці стала буйным асяродкам адукацыі, выхавання і навукі на тэрыторыі Усходняй Беларусі.

**Список использованных источников**


1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. / А. М. Ткачоў, У. С. Пасэ, Г. Р. Сянькевич [і інш.]; пад рэд. М. А. Лазарука [і інш.]. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 464 с.
2. Баршчэўскі, А. Гістарычная, сацыялагічная і гаспадарчая рэчаіснасць Полацка на старонках часопіса «Полацкі штомесячнік» / А. Баршчэўскі // Полацк: карані нашага радавода: Полацкая зямля як сацыякультурная прастора ўзнікнення і развіцця беларускага этнасу і нацыянальнай дзяржаўнасці. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 5-6 верасня 1995 г. / рэд. А. Мальдзіс, Р. Грудніцкі, В. Шайкоў. – Полацк, 1996. – С. 150–158.
3. Белецкий, А. В. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования 1803–1832 гг. Отд. 3. Учебные заведения Витебской и Могилёвской губерний в 1803–1832 гг. / А. В. Белецкий. – Вильна : Тип. Сыркина, 1906. – 148 с.
4. Блинова, Т. Б. Иезуитские конвикты в Полоцке (начало XIX – 1820 г.) / Т. Б. Блинова // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : тэзісы дакладаў. – Полацк, 1992. – С. 6–9.
5. Блинова, Т. Б. Иезуиты в Беларуси. Их роль в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 427 с.
6. Богоненко, В. А. Полоцкая академия 1812–1820 / В. А. Богоненко. – Минск : А. Н. Вараксин, 2017. – 156 с.
7. Грамота, данная Полоцкой иезуитской академии 1.03.1812 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб. : Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830. – Т. 32. – № 25019. – С. 208–210 (далей – ПСЗ-1).
8. Денисенко, Е. П. «Miesięcznik Połocki» (1818) в фондах Центральной научной библиотеки им. Я. Коласа Национальной академии наук Беларуси / Е. П. Денисенко // Матэрыялы XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі: погляд праз стагоддзі», Мінск, 7-8 красавіка 2016 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [складальнікі: Т.А. Сапега, А. А. Суша]. – Мінск, 2016. – С. 218–223.
9. Зянюк, Р. У. Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1772–1914 гг.) / Р. У. Зянюк. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 299 с.
10. Касмылеў, В. С. Перадгісторыя стварэння акадэміі езуітаў у Полацку / В. С. Касмылеў // Наш радавод. – 1992. – Кн. 4. Ч. 3 : Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII–пачатку XX стст.» (Гродна, 28 верасня – 1 кастрычніка 1992 г.). – Гродна, 1992. – С. 591–595.

11. Катлярчук, А. С. Жазэф дэ Мэстр і Тадэвуш Бржазоўскі ў справе адкрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі / А. С. Катлярчук // Віцебскі сшытак. – 1997. – № 3. – С. 95–99.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5119.
13. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 431.
14. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4119.
15. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 50170.
16. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 50171.
17. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1398.
18. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 28. Спр. 59.
19. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 28. Спр. 215.
20. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 28. Спр. 216.
21. Новоселов, А. Ревизия профессором Сенковским белорусских училищ в 1826 г. Материалы для истории народного просвещения в Северо-Западном крае / А. Новоселов // Журнал Министерства народного просвещения. – 1872. – Ч. 160. – № 4. Отд. 2. – С. 159–207; Ч. 161. – № 5. Отд. 2. – С. 74–122.
22. О невзимании впредь до указа поголовных и за винную продажу денег с крестьян, состоящих за иезуитскими монастырями в Белорусских губерниях: именной указ 13.01.1774 г., данный генерал-фельдмаршалу графу Чернышеву // ПСЗ-1. – Т. 19. – № 14102. – С. 892.
23. О переименовании Полоцкой иезуитской коллегии Академию иезуитского ордена с присвоением ей преимуществ, дарованных университетам: именной указ 12.01.1812 г., данный Сенату // ПСЗ-1. – Т. 32. – № 24952. – С. 10–11.
24. Сапунов, А. П. Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А. П. Сапунов. – Витебск : Тип. губернского правления, 1890. – 34 с. перадрук гл.: Полоцк : издатель Л. Ф. Данько, 1997. – 30 с.; Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг. : в 2 ч. – Полоцк : А. И. Судник, 2005. – Ч. 2 / сост., примеч. и вст. ст. Л. Ф. Данько, А. И. Судника. – С. 7–40. 48 с., ил. (Наследие Полоцкой земли; Вып. 3).
25. Сапунов, А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии / А. Сапунов. – Витебск : Типография губернского правления, 1884. – 167, CLXXVII с.
26. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. – Изд. 2-е. – СПб. : Тип. В. С. Балашева, 1875–1876. – Т. 1 : Царствование императора Александра I 1802–1825 гг. – 1875. – 1864 стб., 43 с., 44 стб.
27. Серабракоў, З. Філязофія акадэміі езуітаў у Полацку [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// epolotsk.com/. – Дата доступа: 29.05.2022.
28. Смоленчук, А. Ф. Полоцкая академия 1812–1820 гг. // Наш радавод. – 1992. – Кн. 4. Ч. 3 : Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII– пачатку XX стст.» (Гродна, 28 верасня – 1 кастрычніка 1992 г.). – Гродна, 1992. – С. 596–603 (пераклад працы: Janowski, L. Uniwersytet w Połocku / L. Janowski // Kurier Litewski. – 1906. – № 73, 74).
29. Умецкая, Е. С. «Месенчник Полоцкий» – первый журнал дореволюционной Белоруссии / Е. С. Умецкая // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. – Минск, 1972. – Вып. 2. – С. 148–163.
30. Філатава, А. Полацк 1818 г. Па матэрыялах часопіса «Miesęcznik Połocki» / А. Філатава // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 59–60.
31. Цыбуля, В. А. Бібліятэка Полацкай езуіцкай акадэміі / В. А. Цыбуля // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1994. – Т. 2. – С. 37.
32. Цярохін, С. Ф. Многія прыйдуць пад імем маім: Езуіты на Беларусі / С. Ф. Цярохін. – Мінск : Полымя, 1995. – 143 с.
33. Шайкоў, В. «Обречённая» акадэмія: да лёсу Полацкай езуіцкай акадэміі (1812–1820 гг.) / В. Шайкоў // Полацк: карані нашага радавода. Полацкая зямля як сацыякультурная прастора ўзнікнення і развіцця беларускага этнасу і нацыянальнай дзяржаўнасці : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 5–6 верасня 1995 г. / рэд. А. Мальдзіс, Р. Грудніцкі, В. Шайкоў. – Полацк, 1996. – С. 173–181.
34. Шайкоў, В. Полацкая езуіцкая акадэмія (1812–1820 гг.) / В. Шайкоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4. – С. 73–81.
35. Шалькевіч, В. Полацкая езуіцкая акадэмія / В. Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2003. – Т. 5. – 1999. – С. 531.
36. Шыдлоўскі, С. А. Штодзённае жыццё студэнтаў Полацкай акадэміі: паводле ўспамінаў Э. Т. Масальскага [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// epolotsk.com/. – Дата доступа: 29.05.2022.
37. Breżgo, B. Sztuki piękne w kolegium oraz w Akademii OO. Jezuitów w Połocku w XVIII i XIX w. / B. Breżgo // Prace Sekcji Historycznej Sztuki Wileńskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk. – 1939. – T. 3. – S. 29–39.
38. Gach, P. P. Działalność duszpasterska jezuitów prowincji białoruskiej w latach 1773–1820 w świetle liczb / P. P. Gach // Jezuicka ars historica. Prace ofiarowane Księdzu Profesorowi Ludwikowi Grzebieniowi S.J. – Kraków : Wyd. WAM, 2001. – S. 161–177.
39. Giżycki, J. M. [Wołyniak]. Materiały do dziejów Akademii Połockiej i szkół od niej zależnych / J. M. Giżycki [Wołyniak]. – Kraków : druk. W. L. Anczyca i Spółki, 1905. – 288 s.
40. Giżycki, J. M. [Wołyniak]. Notatka o Akademii i szkołach jezuitów w Połocku / J. M. Giżycki [Wołyniak]. – Poznań : druk. J. Leitgebra, 1884. – VIII, 28 s.
41. Kadulska, I. Akademia Połocka. Ośrodek kultury na Kresach 1812–1820 / I. Kadulska. – Gdańsk : Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego, 2004. – 312 s.
42. Kadulska I. Akademia Połocka u progu działalności / I. Kadulska // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Полацк, 24–25 кастрычніка 2007 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2009. – С. 245–251.
43. Kadulska, I. Kulturowa misja Akademii Połockiej na Białej Rusi. Pierwsza podróż do źródeł / I. Kadulska // Jezuicka ars historica. Prace ofiarowane księdzu profesorowi L. Grzebieniowi SJ / pod red. M. Inglota, S. Obirka. – Kraków : Wydawnictwo WAM, 2001. – S. 245–253.
44. Kadulska, Irena. źródła do dziejów drukarni Kolegium Jezuickiego i Akademii Połockiej (1787–1820) / Irena Kadulska // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 143–150.

45. Lichocka, H. «Miesięcznik Połocki» (1812–1820). Kontekst historyczny i bibliografia zawartości / H. Lichocka // Wklad jezuitów do nauki i kultury w Rzeczypospolitej obojga narodów i pod zaborami / pod red. I. Stasiewicz-Jasiukowej. – Kraków-Warszawa, 2004. – S. 631–661.
46. Urządzienie konwiktu szlachetnej młodzi przy szkole wyźszej Połockiej XX pijarów na Białej Rusi // Wizerunki i roztrząsania naukowe. Poczet nowy drugi. – Wilno, 1841. – T. 20.
47. Uwiadomienie o konwikcie Połockim jezuickim // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 2. – № 7.
48. Załęski, S. Jezuici w Polsce : w 5 t. / S. Załęski. – Kraków : Druk W. L. Anczyca i Spółki, 1907. – T. 5 : Jezuici w Polsce porozbiorowej 1773–1905. – Cz. 1 : 1773–1820. – XXI, 517 s.

## POLOTSK JESUIT ACADEMY: ORGANIZATIONAL, FINANCIAL AND MATERIAL-ECONOMIC ASPECTS OF ITS CREATION, OPERATION AND DISSOLUTION

***A. Yerashevich***

*Based on published and archival sources, data from research literature, the article considers organizational, financial and material-economic aspects of the creation, operation, and termination of the contract Polotsk Jesuit Academy – the first higher education institution in the territory of modern Belarus during the time of imperial Russia in 1812-1820. Attention is paid to the sources and types of funding for the center of higher education in Polotsk with the status of a university. Clarifications and additions were made regarding the financial support for the activities of the successor of the Jesuit Academy – the Polotsk Higher Piyarskaga School.*

***Keywords:*** *Jesuits; Polotsk; academy; higher education institution; funding; resources.*